принципы законности;

признания, соблюдения и защиты прав, свобод и законных интересов граждан, а также прав и законных интересов организаций;

сочетания гласных и негласных методов противодействия экстремизму;

приоритета обеспечения национальной безопасности Республики Беларусь;

сотрудничества государства с организациями и гражданами;

приоритета предусмотренных законодательством об основах деятельности по профилактике правонарушений и о противодействии экстремизму мер профилактики правонарушений, направленных на выявление и устранение причин и условий, способствующих экстремистской деятельности (далее – профилактические меры);

неотвратимости наказания за экстремистскую деятельность.

В числе основных направлений противодействия экстремизму вышеуказанный закон называет:

гражданское и патриотическое воспитание детей и молодежи, формирование у граждан духовно-нравственных ценностей, гражданственности и патриотизма;

осуществление профилактических мер;

предупреждение, выявление и пресечение экстремистской деятельности.

Сегодня мы можем говорить о том, что на территории Республики Беларусь, как и во время существования СССР, не выработан единый комплексный подход в изучении вопроса противодействия экстремизму, однако это никак не связано с политикой белорусского государства и становлением государственной власти, как это было в СССР, а в первую очередь исходит из того, что экстремизм на территории Республики Беларусь проявлялся в меньшей степени, и у правоохранительных органов не было существенных проблем по противодействию экстремистским проявлениям. За последние несколько лет ввиду начала активной противоправной деятельности экстремистских формирований, их финансовой поддержкой из-за рубежа, и активным использованием сети Интернет республика столкнулась с совершенно новыми формами экстремизма, которые проявили себя в 2020 г. Можно констатировать факт отсутствия глубокого и всестороннего изучения проблемы противодействия экстремизму в Республике Беларусь. Исходя из вышеизложенного, с целью сохранения государственности, конституционного строя и недопущения каких-либо вооруженных конфликтов на территории Республики Беларусь, полагаем, имеется необходимость глубокого и всестороннего изучения проблемы экстремизма как негативного для государства и общества явления и вопроса противодействия ему на любых стадиях проявления.



УДК 342(47 + 57) + 342.4(476)

***С.Ф. Лапановіч***

## УДЗЕЛ ССРБ–БССР У СТВАРЭННІ СССР І КАНСТЫТУЦЫІ СССР 1924 Г.

У выніку ўзброенага паўстання 25–26 кастрычніка 1917 г., галоўным арганізатарам якога была партыя бальшавікоў на чале з У.І. Леніным, а непасрэднае кіраўніцтва ажыццяўляў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Петраградскага Савета, у Петраградзе быў звергнуты Часовы ўрад. 25–27 кастрычніка адбыўся II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, на якім быў выбраны вышэйшы орган савецкай улады – Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (УЦВК) і сфарміраваны першы савецкі ўрад – Савет народных камісараў (СНК) на чале з У.І. Леніным. Урад РСФСР у Дэкларацыі правоў народаў Расіі абвясціў роўнасць і суверэннасць усіх народаў былой Расійскай імперыі і іх права на самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў. Пры гэтым У.І. Ленін удакладняў, што такое права нацыям будзе прадастаўляцца толькі тады, калі гэта карысна інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі.

30–31 снежня 1918 г. у Смаленску адбылася VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя Усерасійскай Камуністычнай партыі бальшавікоў (УКП(б)), пераўтвораная ў I з'езд Кампартыі Беларусі (КП(б)Б). Выконваючы рашэнні кіраўніцтва УКП(б), 30 снежня 1918 г. прынята рэзалюцыя «Аб абвяшчэнні Заходняй Камуны Беларускай Савецкай Рэспублікай». 1 студзеня 1919 г. у Смаленску быў падпісаны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, які абвясціў пра прыналежнасць усёй улады ў Беларусі Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Абвяшчалася таксама аб стварэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі. 2–3 лютага 1919 г. у Мінску працаваў I Усебеларускі з'езд Саветаў, на ім была прынята першая Канстытуцыя, якая юрыдычна замацавала новую назву дзяржавы – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь (ССРБ, пазней – БССР). Па аналогіі з РСФСР вышэйшымі органамі ўлады ў Беларусі былі абвешчаны: з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, а ў перапынках паміж з'ездамі – Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК), а такса-

ма Малы і Вялікі Прэзідыумы ЦВК (замест апошніх у 1920 г. створаны СНК).

У тым жа 1919 г. пачалася польска-савецкая вайна, падчас якой была акупіравана значная частка тэрыторыі Беларусі (у лютым 1919 г. уключана ў склад Літоўска-Беларускай (Літбел) ССР). У 1920 г. Чырвоная Армія здзейсніла паспяховае наступленне, што мела вынікам вызваленне тэрыторыі Беларусі і дазволіла 31 ліпеня 1920 г. прыняць Дэкларацыю аб абвяшчэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (Другое абвяшчэнне ССРБ). Вынікам польска-савецкай вайны стала Рыжская мірная дамова 1921 г., па якой тэрыторыя ССРБ была падзелена і заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы.

Падчас Грамадзянскай вайны савецкая ўлада перамагла на значнай частцы былой Расійскай імперыі. У выніку бальшавіцкага дзяржаўнага будаўніцтва савецкімі былі абвешчаны РСФСР, Украінская ССР, ССРБ і ЗСФСР (уключала Азербайджанскую ССР, Армянскую ССР і Грузінскую ССР). Існавалі яшчэ Харэзмская і Бухарская Народныя Савецкія Рэспублікі, а таксама Далёкаўсходняя Рэспубліка. Тэрыторыя ССРБ у 1921–1924 гг. складала толькі шэсць паветаў: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мінскі, Мазырскі і Слуцкі, насельніцтва рэспублікі было прыкладна 1,5 млн чалавек. У такіх абставінах пытанне характару ўзаемаадносін з іншымі, больш вялікімі па памерах і колькасці насельніцтва савецкімі рэспублікамі, стала асабліва важным для ССРБ у кантэксце яе далейшых перспектыў – захавання як фармальна самастойнай савецкай дзяржавы ці ўключэнне ў склад іншай савецкай рэспублікі.

У першыя пасляваенныя гады ўзаемаадносіны РСФСР з іншымі савецкімі рэспублікамі ў асноўным будаваліся на падставе двухбаковых дагавораў аб супрацоўніцтве. 16 студзеня 1921 г. быў падпісаны «Союзный рабоче-крестьянский договор между РСФСР и Социалистической Советской Республикой Белоруссией». У дагаворы існавала супярэчнасць – з аднаго боку, урады РСФСР і ССРБ прызнавалі «независимость и суверенность каждой из договаривающихся сторон», з другога – насуперак гэтаму галоўнаму прынцыпу дакумент ставіў ССРБ фактычна ў становішча аўтаноміі РСФСР. 21 студзеня 1922 г. быў прыняты Дэкрэт Прэзідыума ЦВК ССРБ «О силе для ССРБ декретов и распоряжений РСФСР», а 24 чэрвеня 1922 г. – пастанова III сесіі ЦВК ССРБ «О распространении действия Уголовного кодекса РСФСР на территорию ССР Белоруссии».

Дзейнічалі і шматбаковыя дагаворы ў самых важных галінах і напрамках – напрыклад, Дэкрэтам ЦВК РСФСР ад 1 чэрвеня 1919 г. «Об объединении Советских Республик – России, Украины, Латвии, Литвы,



Беларуси – для борьбы с мировым империализмом» быў афармлены ваенны саюз савецкіх дзяржаў.

Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што абвяшчэнню СССР папярэднічала пераходная форма дзяржаўнага саюза з рысамі, больш характэрнымі для канфедэрацыі, чым федэрацыі. Аднак такая форма дзяржаўнага аб'яднання не магла задаволіць ЦК УКП(б) і савецкі ўрад, паколькі ўскладняла палітычнае і гаспадарчае кіраванне краінай. Супярэчлівасць існуючых федэратыўных формаў была відавочнай: нацыянальныя савецкія рэспублікі (УССР, БССР і інш.) па сваім дэклараваным статусе – самастойныя, суверэнныя дзяржавы, аднак функцыі цэнтралізаванага кіраўніцтва важнейшымі сферамі дзяржаўнага жыцця ажыццяўляліся праз народныя камісарыяты і Вышэйшы савет народнай гаспадаркі (ВСНГ) РСФСР. Прававой асновай было адпаведнае заканадаўства РСФСР, якое мела сілу ва ўсіх рэспубліках. На зыходзе Грамадзянскай вайны сама логіка дзяржаўнага будаўніцтва падводзіла да неабходнасці больш дакладнай урэгуляванасці саюзных адносін, да пераходу да новага этапу дзяржаўнага будаўніцтва – аб'яднання рэспублік у адзіную дзяржаву з агульнымі для ўсіх рэспублік канстытуцыйнымі органамі ўлады і кіравання.

Да сярэдзіны 1922 г. стала відавочнай неабходнасць далейшага ўдасканалення дагаворных адносін рэспублік. Для выпрацоўкі адзінай платформы па гэтым пытанні Палітбюро ЦК УКП(б) 11 жніўня 1922 г. стварыла адмысловую камісію, даручыўшы ёй падрыхтоўку праекта тэзісаў аб далейшых узаемаадносінах савецкіх дзяржаў. У склад камісіі ўвайшлі прадстаўнікі ЦК УКП(б), ЦК кампартый Украіны, Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Далёкаўсходняй Рэспублікі, Бухары і Харэзма. Старшыня гэтай камісіі, наркам па справах нацыянальнасцей І.В. Сталін прапанаваў так званы «Праект аўтанамізацыі». Сутнасць яго рэкамендацый заключалася ў тым, каб Украіна, Беларусь, Азербайджан, Грузія і Арменія ўвайшлі ў РСФСР на правах аўтаномных рэспублік. Пытанне аб Бухары, Харэзме і Далёкаўсходняй Рэспубліцы заставалася адкрытым. Тэзісы «аб аўтанамізацыі» прадугледжвалі заключэнне Саюзнай дамовы, па якой вышэйшыя органы ўлады і дзяржаўнага кіравання РСФСР у найважнейшых пытаннях гаспадарчага і палітычнага жыцця дзейнічалі б як агульнасаюзныя, а іх пастановы і рашэнні з'яўляліся б абавязковымі для ўсіх савецкіх рэспублік. Агульнасаюзным органам па праекце станавіўся УЦВК, у склад якога прапаноўвалася ўвесці прадстаўнікоў аб'яднаных рэспублік.

У.І. Ленін пастаянна цікавіўся працай камісіі ЦК УКП(б). Атрымаўшы матэрыялы абмеркавання праекта тэзісаў кіруючымі партыйнымі органамі, ён падвергнуў яго рэзкай крытыцы. У.І. Ленін разумеў, што

«аўтанамізацыя» можа выклікаць адкрытую, а яшчэ больш скрытую незадаволенасць былых ускраін Расіі і прывесці да расколу ў сацыялістычным лагеры. Каб гэтага пазбегнуць, ён прапанаваў РСФСР прызнаць сябе раўнапраўнымі з Украінскай ССР і іншымі рэспублікамі, і разам і нараўне з імі ўвайсці ў новы саюз, новую федэрацыю – Саюз Савецкіх Рэспублік Еўропы і Азіі.

Ідэя ўтварэння Саюза рэспублік, выпрацаваная У.І. Леніным, хутка была падтрымана і кіраўнікамі савецкіх рэспублік, і большасцю кіраўніцтва партыі бальшавікоў. Улічваючы меркаванні прадстаўнікоў савецкіх рэспублік, У.І. Ленін прапанаваў новы праект дзяржаўнага аб'яднання, вядомы як «Праект федэралізацыі», ці «Саюзны праект». У лісце, дасланым у верасні 1922 г. членам Палітбюро ЦК УКП(б), ён выказаўся за тое, каб савецкія рэспублікі аб'ядналіся ў новую саюзную дзяржаву на аснове поўнага раўнапраўя: «Важна, каб мы не давалі пажытак для розуму «незалежным», не знішчалі іх незалежнасці, а стваралі яшчэ новы паверх, федэрацыю раўнапраўных рэспублік». Кіруючыся ленінскімі заўвагамі, камісія ЦК партыі перапрацавала праект і ўнесла яго на разгляд кастрычніцкага Пленума ЦК УКП(б). З-за цяжкай хваробы У.І. Ленін не змог удзельнічаць у працы гэтага Пленума. У запісцы, дасланай на пасяджэнне Пленума, ён указваў на неабходнасць прыняць такое рашэнне, якое гарантавала б раўнапраўны ўдзел прадстаўнікоў розных рэспублік у кіраўніцтве саюзнай дзяржавы: «Трэба абсалютна настаяць, – падкрэслівалася ў запісцы, – каб у саюзным ЦВК старшынствавалі па чарзе рускі – украінец – грузін – і г. д. Абсалютна!» (цыт. па: У.І. Ленін, т. 45 поўнага збору твораў).

6 кастрычніка 1922 г. Пленум ЦК УКП(б) прыняў распрацаваную па ленінскіх указаннях рэзалюцыю. У савецкіх рэспубліках, у тым ліку ў ССРБ, у лістападзе і снежні 1922 г. адбыліся мясцовыя з'езды Саветаў, на якіх намечанае аб'яднанне савецкіх рэспублік было падтрымана. У ССРБ на валасных і павятовых з'ездах Саветаў былі выбраны дэлегаты на IV Усебеларускі з'езд Саветаў, якія атрымалі наказ галасаваць за стварэнне СССР. Напрыклад, Мінскі Савет у наказе IV з'езда Саветаў БССР выказаў пажаданне, каб яго дэлегаты прынялі рашэнне, якое б забяспечыла «яшчэ больш моцную сувязь савецкіх рэспублік, захоўваючы ў той жа час уплыў кожнай савецкай рэспублікі на справу ўсяго Саюза» (цыт. па: Газета «Звязда», 1922 г.).

14 снежня 1922 г. IV з'езд Саветаў БССР прыняў пастанову аб неабходнасці дзяржаўнага аб'яднання ўсіх савецкіх рэспублік на аснове ўзаемнай роўнасці, цесных палітычных і гаспадарчых сувязей пры забеспячэнні гарантый самастойнага нацыянальна-культурнага будаўніцтва аб'яднаных рэспублік і ажыццяўленні гаспадарчай ініцыятывы кожнай з іх. Дэлегаты ад БССР, абраныя для ўдзелу ў X з'ездзе Саветаў РСФСР, атрымалі паўнамоцтвы і на ўдзел у рабоце I Усесаюзнага з'езда Саветаў.



23–27 снежня 1922 г. адбыўся X з'езд Саветаў РСФСР. Акрамя 1 727 дэлегатаў РСФСР, на ім прысутнічалі 488 паўнамоцных дэлегатаў Украіны, БССР і Закаўказскай Федэрацыі. З'езд аднагалосна прыняў рэзалюцыю аб утварэнні Саюза ССР. У рэзалюцыі прызнавалася своечасовым аб'яднанне чатырох рэспублік (РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР) у адзіны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік на пачатках добраахвотнасці і раўнапраўя, з захаваннем за кожнай з іх права вольнага выхаду з Саюза. Абранай з'ездам дэлегацыі РСФСР было даручана выпрацаваць сумесна з дэлегацыямі Украіны, Беларусі і Закаўказскай Федэрацыі праект дэкларацыі з выкладаннем абставін, якія выклікалі аб'яднанне рэспублік у адну саюзную дзяржаву, падпісаць дагавор аб утварэнні СССР і прадставіць іх на зацвярджэнне I з'езда Саветаў Саюза ССР. 29 снежня 1922 г. адбылася канферэнцыя паўнамоцных дэлегацый РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР. Пасля абмеркавання праекта дэкларацыі і Саюзнага дагавору, якія вызначылі асновы будовы Савецкай саюзнай дзяржавы, былі падпісаны дэлегацыямі савецкіх рэспублік.

30 снежня 1922 г. у Маскве адбыўся I з'езд Саветаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У яго працы ўдзельнічалі 1 727 дэлегатаў ад РСФСР, 364 ад УССР, 33 ад БССР і 91 ад ЗСФСР. З'езд абраў ЦВК СССР у складзе 371 члена і 138 кандыдатаў. З'езд у асноўным зацвердзіў праекты Дэкларацыі аб утварэнні Саюза ССР і Саюзнай дамовы. Улічваючы надзвычайную важнасць гэтых дакументаў, з'езд даручыў ЦВК саюзных рэспублік разгледзець іх і падрыхтаваць па іх свае водгукі. ЦВК СССР даручалася ўвесці ўдакладненыя тэксты Дэкларацыі і Саюзнай дамовы ў дзеянне і прадставіць іх на зацвярджэнне II з'езда Саветаў СССР.

31 сакавіка 1923 г. Старшыня ЦВК БССР А.Р. Чарвякоў далажыў другой сесіі ЦВК БССР IV склікання аб удзеле беларускай дэлегацыі ў рабоце I з'езда Саветаў ССР і аб прынятых з'ездам Дэкларацыі і Саюзнай дамове. Сесія адобрыла дзейнасць дэлегацыі і разгледзела праект Саюзнай дамовы. На сесіі былі прапанаваны папраўкі, якія прадугледжваюць прадастаўленне Саюзу ССР права ўстанаўліваць правілы прыёму ў Саюз новых савецкіх рэспублік, замацаванне за асобнымі рэспублікамі права заключаць са згоды Прэзідыума ЦВК Саюза ССР эканамічныя пагадненні з капіталістычнымі краінамі. Сесія выказала пажаданне, каб кожная савецкая рэспубліка магла мець сваіх паўнамоцных прадстаўнікоў з правам вырашальнага голасу толькі ў вышэйшых заканадаўчых, але і выканаўчых органах Саюза ССР – СНК і Савеце Працы і Абароны.

Важнай задачай стала распрацоўка саюзнай Канстытуцыі. 10 студзеня 1923 г. Прэзідыум ЦВК БССР утварыў камісію ў складзе А.Г. Чарвякова, А.Х. Гетнера, В.А. Нодэля, Н.П. Ітві і В.Л. Дыла, якой было даручана вывучыць праект Канстытуцыі СССР і распрацаваць прапановы па яго паляпшэнні. Прапановы камісіі былі ўсебакова абмеркаваны на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК БССР і адобраны трэцяй сесіяй ЦВК БССР IV склікання.

Прэзідыум ЦВК СССР утварыў канстытуцыйную камісію з 13 чалавек (пазней давёў яе колькасць да 25 чалавек: 14 – ад РСФСР, 5 – ад УССР і па 3 – ад ЗСФСР і БССР). ЦВК БССР даручыў Аляксандру Рыгоравічу Чарвякову (з 1920 г. старшыня Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта, Усебеларускага рэўкама, затым нязменны (да 1937 г.) старшыня ЦВК (да 1924 г. адначасова і Савета народных камісараў ССРБ-БССР)), Адольфу Хрыстафоравічу Гетнеру (з 1920 г. член Мінскага абкама, затым загадчык агульнага аддзела, старшыня Кантрольнай камісіі КПБ(б), генпракурор, затым наркам юстыцыі БССР і намеснік старшыні СНК БССР, з 1922 па 1923 г. займаў пасаду старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) і Вульфу Абрамавічу Нодэлю (з 1920 г. як член УКП(б) знаходзіўся на партыйна-дзяржаўнай працы ў Беларусі: працаваў у прафзвязных арганізацыях, у ЦК Саюза працаўнікоў асветы Беларусі, ЦК Беларускай Кампартыі і ў ЦК ЛКСМ Беларусі, з 1922 па 1924 г. – наркам працы БССР) удзельнічаць у рабоце камісіі Прэзідыума ЦВК Саюза ССР па канчатковай падрыхтоўцы праекта саюзнай Канстытуцыі.

Як адзначае ў фундаментальнай працы «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (т. 1) беларускі савецкі навуковец С.П. Маргунскі, у папраўках да тэксту праекта Канстытуцыі Саюза ССР, перададзеных ЦВК БССР у Канстытуцыйную камісію Прэзідыума ЦВК СССР, абгрунтоўвалася неабходнасць устанаўлення для ўсяго Саюза агульных прынцыпаў унутранага гандлю з захаваннем права кожнай саюзнай рэспублікі на выкарыстанне мясцовых умоў; аднясенні да кампетэнцыі Саюза ССР устанаўлення агульнасаюзнага народнагаспадарчага плана, вызначэння галін прамысловасці і прамысловых прадпрыемстваў агульнасаюзнага значэння; прадастаўлення саюзным рэспублікам права ўводзіць, акрамя агульнасаюзных, рэспубліканскія падаткі; стварэння адзінай для Саюза ССР Чырвонай Арміі; утварэння Савета Нацыянальнасцей на аснове прадстаўніцтва ўсіх савецкіх (саюзных і аўтаномных) нацыянальных рэспублік. Уносілася таксама прапанова аб прадастаўленні Прэзідыуму ЦВК СССР права адмяняць рашэнні ЦВК саюзнай рэспублікі, а сесіі ЦВК Саюза ССР – права прыпыняць дзеянне рашэнняў рэспубліканскіх з’ездаў Саветаў. Адзначалася немэтазгоднасць аб’яднання і пераўтварэння ў бліжэйшы час у саюзна-рэспубліканскія органы наркаматаў асветы, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння. Рэкамендавалася заканадаўча замацаваць раўнапраўе ўсіх моў саюзных рэспублік. Акрамя таго, уносіўся шэраг прапаноў па ўдакладненні асобных фармулёвак праекта Канстытуцыі Саюза ССР.



Адзначым, што большую частку рэкамендацый ад ЦВК БССР камісія Прэзідыума ЦВК СССР уключыла ў тэкст праекта Канстытуцыі СССР. Пагадзімся з С.П. Маргунскім, што гэта сведчыць аб значным укладзе БССР у канстытуцыйнае афармленне савецкай федэрацыі. Напрыклад, пры разглядзе праекта Канстытуцыі СССР у Канстытуцыйнай камісіі вялікая ўвага надавалася размежаванню кампетэнцый саюзных рэспублік і Саюза ССР. Прэзідыум ЦВК БССР лічыў немэтазгоднымі ў пачатковы перыяд стварэння саюзнай Савецкай дзяржавы самастойныя (без ведама ўрада СССР) дыпламатычныя зносіны саюзных рэспублік з капіталістычнымі дзяржавамі і выказаўся за стварэнне адзінага агульнасаюзнага органа, які прадстаўляе ўсе савецкія рэспублікі ў міжнародных адносінах – гэты пункт гледжання быў падтрыманы ўсімі рэспублікамі і адлюстраваны ў Канстытуцыі Саюза ССР.

У ходзе абмеркавання Канстытуцыйнай камісіяй пытання аб будаўніцтве Чырвонай Арміі прадстаўнікі РСФСР прапанавалі аднесці да вядзення ЦВК Саюза ССР устанаўленне асноў будаўніцтва ўзброеных сіл. Прадстаўнікі БССР выказаліся за тое, каб ЦВК Саюза ССР не толькі ўстанаўліваў асновы будаўніцтва арміі, але і арганізоўваў яе. Канстытуцыйная камісія прызнала неабходным ускласці на ЦВК Саюза ССР як устанаўленне асноў будаўніцтва, так і арганізацыю войска, што было таксама замацавана ў Канстытуцыі СССР.

Па прапанове прадстаўнікоў БССР быў устаноўлены наступны прынцып: ні адна саюзная рэспубліка не можа ўступаць у эканамічныя ці якія-небудзь іншыя зносіны з капіталістычнымі краінамі без ведама і згоды Саюза ССР. Абмеркаваўшы пытанне аб арганізацыі ўнутранага гандлю, Канстытуцыйная камісія вырашыла ўключыць у праект Канстытуцыі Саюза ССР прапанаваны Беларускай ССР пункт аб тым, што агульнасаюзныя органы ўстанаўліваюць сістэму і агульныя прынцыпы ўнутранага гандлю, на базе якіх кожная саюзная рэспубліка, прымяняючыся да мясцовых умоў, сама прымае канкрэтныя рашэнні.

Прадстаўнікі ўсіх рэспублік, якія ўступілі ў Саюз ССР, выказаліся за неабходнасць распрацоўкі агульнасаюзных народнагаспадарчых планаў. Яны лічылі, што да кампетэнцыі Саюза ССР павінны быць аднесены ўстанаўленне асноў планавання і выпрацоўка агульнага плана развіцця народнай гаспадаркі краіны, абавязковых для ўсіх саюзных рэспублік. Прадстаўнікі БССР і іншых саюзных рэспублік выказаліся

за захаванне за Саюзам ССР права вызначэння галін прамысловасці і прадпрыемстваў, якія маюць агульнасаюзнае значэнне. Прычым права перадачы адпаведных прадпрыемстваў у вядзенне агульнасаюзных органаў таксама павінна належаць Саюзу ССР, але пры абавязковым удзеле зацікаўленай рэспублікі ў вырашэнні гэтага пытання. Усе рэспублікі лічылі таксама, што Саюзу ССР павінны быць перададзены права заключэння канцэсійных дагавораў, якія маюць агульнасаюзнае значэнне, і кантроль за канцэсійнымі прадпрыемствамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі.

Дэталёва абмяркоўваліся камісіяй бюджэтныя і падатковыя пытанні. Яна прыйшла да адзінага меркавання: у Савецкай дзяржаве павінны быць устаноўлены адзіныя манетная і крэдытная сістэмы, а права на эмісію дадзена Саюзу ССР. У канстытуцыйных камісіях саюзных рэспублік і ў Камісіі ЦВК СССР дэталёва абмяркоўвалася пытанне аб тым, ці павінны бюджэты рэспублік аўтаматычна ўключацца ў бюджэт Саюза ССР або падвяргацца папярэдняй праверцы і ацэнцы саюзнымі органамі. Было вырашана, што ЦВК Саюза ССР павінна належаць права папярэдняй праверкі рэспубліканскіх бюджэтаў. Палажэнне аб тым, што ў саюзны бюджэт уключаюцца бюджэты ўсіх рэспублік, было зафіксавана ў Канстытуцыі СССР толькі ў агульнай форме. Спецыяльнае рашэнне камісіі ЦВК БССР, у якім падкрэслівалася, што пры зацвярджэнні бюджэтаў рэспублік ЦВК Саюза ССР правярае агульныя сумы расходаў і даходаў кожнай рэспублікі і ступень забеспячэння іх уласнымі рэсурсамі, увайшло пасля ў Палажэнне аб дзяржаўным бюджэце.

Як адзначае С.П. Маргунскі, прадстаўнікі Наркамфіна РСФСР выказваліся супраць прадастаўлення рэспублікам права самастойна ўводзіць рэспубліканскія падаткі. Прадстаўнікі БССР і іншых рэспублік лічылі, што за кожнай саюзнай рэспублікай трэба захаваць у пэўных межах права ўстанаўлення сваіх падаткаў. Пры гэтым улічвалася, што тэмпы развіцця рэспублік будуць і ў далейшым неаднолькавымі. Некаторыя з іх у сувязі з гэтым павінны будуць выкарыстоўваць такія крыніцы даходаў, якія для ўсяго Саюза не адыгрываюць вялікай ролі, а для рэспублікі маюць важнае значэнне. Пасля дэталёвага абмеркавання было вырашана ўключыць у праект Канстытуцыі палажэнне аб тым, што рэспублікі могуць уводзіць свае падаткі з дазволу ЦВК Саюза ССР. Мясцовыя падаткі, устаноўленыя для фінансавання тых ці іншых мясцовых патрэб, былі пакінуты ў выключным вядзенні рэспублік.

У ходзе абмеркавання структуры ЦВК Саюза ССР у Канстытуцыйнай камісіі ўзнікла пытанне аб характары яго другой палаты – Савета Нацыянальнасцей: ці з'яўляецца яна органам, які прадстаўляе толькі саюзныя рэспублікі, ці павінна прадстаўляць усе нацыянальныя рэспублікі



краіны? Улічваючы меркаванне прадстаўнікоў саюзных рэспублік, у тым ліку і БССР, Канстытуцыйная камісія прызнала, што ў Савеце Нацыянальнасцей павінны быць прадстаўлены ўсе нацыянальныя рэспублікі і аўтаномныя вобласці краіны.

У выніку абмеркавання пытання аб узаемаадносінах СНК СССР і саюзных наркаматаў з цэнтральнымі органамі дзяржаўнага кіравання саюзных рэспублік было вырашана, што агульнасаюзныя наркаматы шляхоў зносін, па замежных справах, па ваенных і марскіх справах, знешнім гандлі, пошт і тэлеграфаў павінны мець у саюзных рэспубліках сваіх упаўнаважаных і праз іх ажыццяўляць кіраўніцтва адпаведнай галіной дзяржаўнага кіравання. Аб'яднаныя саюзна-рэспубліканскія народныя камісарыяты працы, харчавання, фінансаў, рабоча-сялянскай інспекцыі і ВСНГ павінны ў сваёй дзейнасці кіравацца дырэктывамі адпаведных саюзных наркаматаў. Прадстаўнікі РСФСР унеслі прапанову аб тым, каб і астатнія наркаматы (асветы, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння) уваходзілі ў склад СНК СССР. Аднак прадстаўнікі іншых рэспублік, у тым ліку і БССР, выказаліся супраць гэтай прапановы. Яны ўказвалі, што аб'яднанне гэтай групы рэспубліканскіх наркаматаў акажацца магчымым толькі праз некаторы час, калі выраўнуюцца ўмовы развіцця саюзных рэспублік і тэмпы іх гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Канстытуцыйная камісія ўсебакова разгледзела пытанне аб гарантыях суверэнітэту кожнай саюзнай рэспублікі. У выніку абмеркавання склалася аднадушнае меркаванне, што асноўная і сапраўдная гарантыя – гэта права выхаду кожнай рэспублікі са складу Саюза ССР. Такое права саюзных рэспублік і было заканадаўча замацавана ў Канстытуцыі СССР.

У ліпені 1923 г. другая сесія ЦВК СССР зацвердзіла тэкст Канстытуцыі. Затым Канстытуцыю ратыфікавалі ўсе чатыры саюзныя рэспублікі: РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР. Канчатковы тэкст Канстытуцыі СССР быў зацверджаны на II Усесаюзным з'ездзе Саветаў 31 студзеня 1924 г.

Кіраўніцтва БССР цесна звязвала статус рэспублікі ў саюзнай дзяржаве з вырашэннем беларускага тэрытарыяльнага пытання і рэалізавала курс на пашырэнне тэрыторыі дзяржавы. Перагляд граніц паміж БССР і РСФСР увайшоў у савецкую гісторыю як узбуйненне БССР. У 1924 г. у склад Беларускай ССР былі вернуты 15 паветаў і асобныя воласці Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. У выніку тэрыторыя рэспублікі павялічылася больш чым у два разы, колькасць насельніцтва склала 4,2 млн чалавек. У 1926 г. былі вернуты Гомельскі і Рэчыцкі паветы, што ўяўляла сабой важны этап у працэсе аб'яднання беларускай нацыі, які быў завершаны толькі ў верасні 1939 г. з аб'яднаннем БССР і Заходняй Беларусі.

Такім чынам, уключэнне БССР у склад СССР стала важным этапам развіцця беларускай дзяржаўнасці. Беларускія дзяржаўныя і партыйныя дзеячы актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні СССР і распрацоўцы першай Канстытуцыі СССР 1924 г.

УДК 340.128

***О.О. Лемешевский***

## О НЕКОТОРЫХ ВОПРОСАХ РАЗВИТИЯ СОВЕТСКОГО ПРАВА

Переломным моментом истории всей науки, в том числе и юридической, был 1917 г. Приход в октябре 1917 г. к власти большевиков наметил масштабные реформы в стране, что не могло не затронуть правовую сферу. Поскольку право является важнейшей составляющей общественной жизни, и регулирует практически все отношения, складывающиеся в повседневной жизни граждан.

Особенно трудными для юридической науки, образования были первые годы советской власти. Новые специфические источники права, отсутствие четкого определения советского права требовали решительных шагов для заполнения пробелов. Революционные преобразования, безусловно, имели положительное значение для различных правовых институтов.

Например, инновации, затронувшие трудовое и семейное право, социальное обеспечение, в значительной мере носили передовой характер. В дальнейшем систематизация советского права закрепила эти изменения и дала толчок к развитию смежных положений, что способствовало росту юридической науки.

На основе анализа научной литературы выделяются следующие этапы становления права в первоначальный период после Великой Октябрьской социалистической революции:

1) 1917–1921 гг. (от процесса отмены буржуазных норм права после Великой Октябрьской социалистической революции и введения в науку категории пролетарского права до перехода к мирному социалистическому строительству и разработке принципов новой экономической политики, принятой 21 марта 1921 г. на X съезде ВКП(б));

2) 1921–1931 гг. (характеризовавшийся оживленной философской дискуссией о судьбах права и государства после пролетарской революции и допускавший определенный плюрализм концепций правопонимания, который завершился сплочением теоретиков права вокруг созданного журнала «Под знаменем марксизма», определившего в качестве



важнейших задач беспощадную критику всех антимарксистских и, следовательно, антиленинских установок в юридической науке);

3) 1931–1938 гг. (характеризующийся стремлением ученых-юристов критически переработать сложившуюся к тому времени систему взглядов о праве и утвердить общеобязательную марксистско-ленинско-сталинскую «генеральную линию» в юридической науке, которая была утверждена на Совещании Института права АН СССР по вопросам науки советского государства и права 16–19 июля 1938 г.).

Следует также отметить, что недостаточное внимание к праву в первый период образования Советского государства повлияло на юридическое образование в целом и его качественное состояние. Самым трудным периодом в этом плане было время Великой Отечественной войны. В РСФСР к началу 1945 г. среди работающих в народных судах высшее юридическое образование имели только 10 %, среднее – 24 %, юридические курсы – 46 % и не имело юридического образования – 18,5 %. Среди адвокатов юридического образования не имело 40 % состава. В связи с этим в октябре 1946 г. было принято постановление «О расширении и улучшении юридического образования в стране». Во исполнение этого постановления были организованы Высшие курсы усовершенствования юристов с годичным сроком обучения для переподготовки руководящих работников органов юстиции, суда и прокуратуры и девятимесячные юридические курсы для переподготовки народных судей, районных прокуроров и следователей. Последние были открыты в крупных городах страны.

В послевоенный период был принят закон, положивший начало международному уголовному законодательству в СССР – Закон от 12 марта 1951 г. «О защите мира». Им устанавливалась уголовная ответственность за пропаганду войны, в какой бы форме она ни велась. Следует отметить, что именно советской науке принадлежат глубокие разработки о преступлениях против мира и человечества. Еще в 1930-х гг., с захватом нацистами власти в Германии, в СССР появляются серьезные монографические исследования об ответственности за тяжкие международные преступления.

Сразу после XX съезда Коммунистической партии Советского Союза в 1956 г. началась интенсивная работа по подготовке нового уголовного законодательства. СССР создает фундамент уголовного законодательства, законы о государственных и воинских преступлениях, республики издают уголовные кодексы. Важным моментом изменения уголовного законодательства стала отмена существующего ранее принципа аналогии, т. е. общественно опасным стало считаться деяние, только прямо предусмотренное законом.